знакомились, обменивались новостями, поддерживали нужные контакты. То, что многие дворяне писали в дневниках о своих эмоциональных впечатлениях от увиденного, свидетельствует о том, что театральные вечера имели важное значение в проведении интеллектуального досуга харьковского дворянства.

Помимо чтения и посещения театра, в письмах и воспоминаниях представителей харьковской элиты того времени упоминалось об увлечении ими собранием художественных коллекций. В письмах Н.Ф. Алфёрова за 1849 г. упоминалось о покупках картин таких художников, как Рембрандт, Рубенс и других представителей голландской, фламандской и немецкой художественных школ [1, с. 40]. Такая информация говорит о разнообразии художественных предпочтений харьковских помещиков и их представлений о живописи.

Таким образом, особенностью повседневной жизни харьковского дворянства была потребность в чтении, в развитии свого духовного мира, увлечении театром, особенно в женской среде, что помогает нам понять культурную роль провинциальной элиты. Наиболее образованные из них читали литературу на иностранных языках, а увлеченные собственной историей и своебразием – и украинскую. Разнообразные читательские предпочтения свидетельствуют о значимости книги в жизни дворянства, интересу их к нуждам времени.


1. Алфьоров, О.А. Старшинський рід Алфьорових: генеалогія, соціально-політичне та майнове становище слобідської гілки другої половини XVII – поч. XX ст. / О.А. Алфьоров. – Біла Церква, Видавець Олександр Пшонківський, 2009. – 150 с.
2. Балакин, В.С. Интеллектуальная история науки: проблема и перспективы исследования / В.С. Балакин // Серия «Социально-гуманитарные науки», выпуск 10. Вестник ЮУрГУ. – № 6. – 2008. – С. 7–10.
3. Задонская, Е.В. Быль XIX столетия. В 4 т. / Е.В. Задонская. – Х., 1907. – Т. 1. – 405 с.
4. Зборовец, И.В. Александра Монтвит в Харьковском институте благородных девиц: монография / И.В. Зборовец. – Харьков: «Форт», 2015. – 140 с.
5. Письма Г.Ф. Квитки к А.А. Краевскому // Киевская старина. – 1893. – № 11–12. – С. 213–222, 376–384.
6. Репина, Л.П. История исторического знания: пособие для вузов / Л.П. Репина, В.В. Зверева, М.Ю. Парамонова. – М.: Дрофа, 2004. – 288 с.
7. Центральний державний історичний архів України в м. Києві (далі – ЦДІАК). – Ф. 2027. Оп.1. Д. 2157.
8. ЦДІАК. – Ф. 2027. Оп. 1. Д. 2158.
9. ЦДІАК. – Ф. 2027. Оп. 1. Д. 2159.



**Ермалёнак В.А.**


## НАТАТНІК 1900 ГОДА ЯФРЭЙТАРА ІЗЫДОРА КУЗНЯЦОВА ЯК ГІСТАРЫЧНАЯ КРЫНІЦА

У 2013 годзе ад жыхара горада Мёры В. Канюшэўскага намі была набыта для гістарычнага музея СШ № 3 г. Мёры запісная кніжка канца XIX – пачатку XX стагоддзя [1].

Нататнік быў знойдзены выпадкова на гарышчы хаты, папярэдні гаспадар хаты невядомы. У нататніку знаходзіўся пашпарт 1917 года на імя друйскага мешчаніна Паўла Міхайлава, а таксама разліковая квітанцыя Дзяржаўнага зямельнага банку 1894 года, таксама на прозвішча Міхайлава.

Памеры запісной кніжкі 11 см у шырыню і 18 см у даўжыню. Вывучэнне зместу кніжкі паказала, што яна складаецца з запісаў розных аўтараў і розных часоў, але падшытых у адзін асобнік. Усе запісы выкананы на рускай мове да рэформы 1918 года. Падшыты ўсе старонкі ільнянымі ніткамі. Напачатку ў кніжцы змешчана “Поминание», з якога мы даведваемся, што яно належыць друйскаму мешчаніну Мікіце Паўлавічу Міхайлаву, які пражывае ў засценку Ляндэрня Нова-Пагосцкай воласці, а запісаны ўпамінкі спеваком з вёскі Моцеўкі Пятром Рыгоравічам Бабічам. Пазначана і дата заканчэння запісаў – 19 студзеня 1945 года. На першай старонцы змешчаны малюнак лестаўкі і апісанне яе вырабу, а таксама узор малітвы на ёй. Усяго змешчана ва ўпамінках 125 імёнаў памерлых мужчын, жанчын, падлеткаў і дзяцей.

Для даследчыка найбольш цікавымі з’яўляюцца запісы, якія пачынаюцца далей, ужо на іншай паперы. У адрозненне ад папярэдніх яны выкананы іншым почыркам, другім чарнілам. Лісты гэтых мемуараў пранумараваны, усяго 130 старонак. Дзякуючы запісу, на 106 старонцы мы даведваемся, што іх аўтар яфрэйтар 21-га Усходне-Сібірскага палка Ізыдор Іванавіч Кузняцоў з вёскі Стары Пагост, якая размешчана за 20 кіламетраў на поўдзень ад Мёраў. Аўтар прыняў удзел у так званым “кітайскім паходзе” рускай арміі, які быў накіраваны на падаўленне паўстання іхэтуаней ў Кітаі.

Аб паўстанні іхэтуаняў напісана зусім мала ўспамінаў [2]. Знойдзены намі дзённік сапраўды ўнікальны, бо яго напісаў звычйны салдат. Пачынаюцца ўспаміны запісамі найбольш папуляр-

ных у тыя часы лірычных песняў на рускай мове. Усе вытрымкі з нататніка прыведзены намі з захаваннем арфаграфіі аўтара запісаў. Першы запіс у дзённіку – верш-песня знакамітага рускага паэта Аляксея Кальцова (1809–1842) "Давайте бокалы! Давайте вина. Радость-мгновение, пейте до дна!". Далей змешчаны тэкст рускай народнай песні, якая была запісана яшчэ ў 1780 годзе і праз сто год не страціла сваёй папулярнасці:

Волга-реченька глубока,
Прихожу к тебе с тоской:
Мой сердечный друг далече
Ты беги к нему волной.

Як мы бачым, у запісу песні напісана слова не "далеко", а "далече", што пацвярджае, што аўтарам запісаў быў старавер.

Ёсць у нататніку і запіс верша маладога тады паэта Георгія Чулкова (1878–1939 гг.): "Слушай радость, одно слово, где ты, светик мой, живёшь..". Адразу гэты верш стаў народнай песняй-частушкай, якая стала папулярнай, асабліва паміж салдат.

Таксама ў запісной кніжцы змешчаны верш Аляксея Кальцова "К милой". Асабліва цікавым даследчыкам будзе верш "Тебя, душа моя милая", аналагаў падобнага намі не знойдзена.

Найбольш унікальнымі з'уляюцца змешчаныя ў запісной кніжцы вершы з тэатра ваенных дзеянняў у Маньчжурыі. Аўтарства іх невядомае, яны часта не маюць рыфмы. Многія з іх пераказаны з твораў мінулых стагоддзяў. Напрыклад: «Собираемся ребята, во единый, во кружок, вспомним, братцы мы ребята, девятисотый годок. Вдруг привозят нам приказ - назначают в поход нас. Полк Амурский пополнять, Благовещенск охранять».

Цікава, што ў вершах і песнях прасочваецца ўвесь перыяд паўстання іхэтуаняў у Кітаі. Так, спачатку даецца апісанне адступлення нешматлікага рускага войска: "..ну, нажгли тут нам пятки проклятые дьяволы. Мы бежали без оглядки, чуть не лопнули глаза..".

З вершаў мы даведваемся і аб жорсткасці кітайскіх паўстанцаў, аб якіх салдаты ведалі добра: "Если, братцы, по случаю видишь, окружают вдруг тебя. Вынь скорей из ножон шашку, режь по брюху сам себе. Лучше смерть, чем живому в плен к китайцем попадать... Шкуру шубой с тебя снимут, с рук ногти оборвут, члены все потом отнимут, голову на шест воткнут".

У гэтых вершаваных пераказах называюцца канкрэтныя героі тых баёў з кітайцамі: "Командир наш пятой сотни Разунов был молодец. Да здесь на вылазке в несчастьи поразил его свинец…". Або яшчэ: "Командир четвёртой сотни хотел пушку отобрать. А китаец уж за время начал ящик зажигать. Вдруг снаряды разорвались, наш герой упал с коня. Его душу всяк помянет вечну память говоря…". Далей у вершах паступова прасочваюцца пераможныя матывы: "Дай мы китайцев не считали, поразбили мы их тут. Пусть кто хочет их считает. А нам самим не до них. Своих раненых собрали, на носилках понесли".

Непасрэдна мемуары пра падарожжа на Далёкі Усход на вайну з кітайцамі пачынаюцца толькі з 29 старонкі. Яфрэйтар Ізыдор Кузняцоў пачынае падрабязна апісваць свае ўражанні ад самага пачатку з 1 жніўня 1900 года, калі па ўказу Яго імператарскай вялікасці ў Коўна (зараз Каўнас), дзе служыў наш зямляк, прыйшоў загад, каб ад кожнай пяхотнай дывізіі прызначылі па адной роце ваеннага складу для адпраўкі на Далёкі Усход на тэатр ваенных дзеянняў. Ізыдора Кузняцова вызначаюць у ліку лепшых салдат і афіцэраў 28 пяхотнай дывізіі (усяго 235 чалавек) для адпраўкі на падаўленне паўстання іхэтуаняў у Кітаі. Усяго было адабрана тры афіцэры, 20 унтэр-афіцэраў, 20 яфрэйтараў і 192 радавых. Аўтар запісак пачынае свой аповед з падзей ў горадзе Коўна, дзе адбыліся ўрачыстыя провады вайскоўцаў. Усе чатыры палкі 28 дывізіі былі пастроены ў выглядзе квадрата. У цэнтры зводная рота, падрыхтаваная для адпраўкі. Палкавы бацюшка Ізмайлаў адслужыў разам з выдатным хорам пеўчых малебен за добрую дарогу. Святар благаславіў спачатку афіцэраў, а потым і радавых, якія адпраўляліся на Далёкі Усход. Падчас благаслаўлення кожны атрымліваў срэбраны нацельны крыжык і цалаваў палкавы сцяг. Перад войскам выступіў з кранальнай прамовай камандзір корпуса генерал-лейтэнант Чайкоўскі. Ён заклікаў абараняць Гасудара Айчыны, радзіму, праваслаўную веру. Ваяваць так, як хадзілі ў бой з ворагам дзяды і бацькі. Прамова генерала выклікала ва ўсіх на вачах слёзы. У канцы ён прамовіў: "Прысягайце сцягу, служыць верай і праўдай, каб мелі гонар атрымаць ад Гасудара яшчэ адзін такі сцяг".

Пасля прамовы камандзір палка палкоўнік Самсонаў загадаў ротнаму камандзіру весці роту ў памяшканне Афіцэрскага сходу. Пад музыку палкавага аркестра рота была праведзена з пляца ў сад, дзе былі накрыты сталы з напоямі і пачастункамі. У наступныя дні праходзіла падрых-



Репозиторий ВГУ

тоўка да паходу: збіраўся рыштунак і амуніцыя. 12 жніўня, як апісвае аўтар мемуараў, адбылося чарговае пастраенне, на якое прыехаў камандзір дывізіі генерал-лейтэнант Кіслінскі. Ён павіншаваў салдат з будучым паходам і, узяўшы абраз святога Іллі, благаславіў ім ротнага камандзіра. Затым да салдат звярнуўся з прамовай, што гэты абраз ужо быў на вайне і ратаваў жыццё салдатам. 13 жніўня быў атрыманы загад рухацца на чыгуначны вакзал. Па дарозе ў Петрапаўлаўскім саборы адбыўся малебен на дарогу, які адслужыў Ковенскі епіскап Міхаіл. Напрыканцы ён паблагаславіў усіх салдат і падараваў кожнаму па сярэбранаму крыжыку і маленькай іконцы. Да вакзала салдат праводзіла ковенскае грамадства з музыкай і вітальнымі крыкамі "ўра". Перад вагонамі вітаў адпраўку салдат і сам ковенскі губернатар. Для кожнага салдата асабіста ад губернатара быў падрыхтаваны пачастунак па бутэльцы піва і паўбутэлькі гарэлкі, булка і 10 цыгарэт. Увесь час іграла музыка. У пяць гадзін вечара пад крыкі "ўра" і ваенную музыку цягнік з салдатамі адправіўся з вакзала. Аўтар запісак занатаваў, што ў гэтыя хвіліны "невольно покатились горячие слёзы по белому солдатскому лицу. И жалко было расстаться со своей родной стороной и со своими товарищами, с которыми жили как с родными братьями".

Далей Кузняцоў апісвае ўвесь шлях на Далёкі Усход. У 12 ночы прыбыў цягнік у Вільню, як піша Ізыдор, быццам дадому, зусім родны для яго горад, бо тады Дзісненскі ўезд уваходзіў у Віленскую губернію.У Вільні па загадзе воінскага начальніка ўсіх салдат разбудзілі і выдалі ізноў па бутэльцы піва і паўбутэлькі гарэлкі і булку з мясам. Тут салдаты сталі спяваць і танчыць так, што атрымалі яшчэ па чарцы гарэлкі. Наступны прыпынак быў у Баранавічах, дзе салдатам выдалі абед, і ад воінскага начальніка ў падарунак па два фунты цукру. Як піша ў нататніку Кузняцоў, салдаты ад выпітай гарэлкі пачалі сябе дрэнна паводзіць і таму атрымалі вымову ад капітана Някрасава.

15 жніўня эшалон прыбыў у горад Роўна, дзе салдат пакармілі абедам і адпусцілі на некалькі гадзін гуляць па горадзе. У Кузняцова ад выгляду горада былі дваякія ўражанні. З аднога боку, горад прыгожы, але ў той жа час вуліцы вузкія і брудныя. Уразіў горад і нізкімі цэнамі на садавіну і гародніну. Наступны абед для салдат быў толькі на станцыі Казацін, дзе, як піша наш зямляк, ім выдалі перасоленую кашу. У дарозе было весела, салдаты спявалі, іграў гармонік, а хто меў грошы, то набываў і гарэлку.

Чарговы абед без кашы і без порцый быў у горадзе Берзул, пасля якога эшалон прыбыў у Адэсу. Тут салдат размясцілі ў турэцкіх казармах 16 стралковага палка. Ізноў аўтар запісак заўважае, што з аднога боку, казармы зручныя, ёсць вадаправод, а з другога, унутры непрыгожая абстаноўка, таму, як піша Кузняцоў "нашы цесляры пабудавалі б лепш". У Адэсе салдаты знаходзіліся з 18 жніўня па 5 верасня. Нашага земляка ўразіла прыгажосць горада, яго шырокія і прамыя вуліцы і тратуары. Захапляецца наш аўтар дзённіка і прыгожымі акацыямі, якімі абсаджаны вуліцы і двары, і якія ствараюць так патрэбную ў гэтым спякотным паўднёвым горадзе прахалоду. Асабліва ўразілі сваёй прыгажосцю вуліцы Дзерыбасаўская, Екацярынінская, Прэабражэнская, Набярэжная не толькі сваімі разнастайнымі крамамі, але і тым, што асвятляліся электрычнасцю, а не газавымі ліхатарамі. Як піша Кузняцоў, прыгажосць гэтага горада будзе памятаць да апошніх дзён свайго жыцця.

Толькі 5-га верасня ў 12 гадзін дня салдаты, якія накіроўваліся на Далёкі Усход, пачалі пасадку на англійскі параход, які аўтар нататак называе "Цыгыман". На караблі быў адслужаны малебен на шчаслівае падарожжа манахам з афонскага манастыра. Толькі ў 5 гадзін вечара параход зняўся з якара і адправіўся ў доўгі шлях. На беразе шматлікі натоўп крычаў "ура", і людзі падымалі рукі ўгору, просячы ў Госпада добрай дарогі. Салдаты крычалі ў адказ звычнае "ўра". Важна адзначыць, што старавер, якім быў Кузняцоў, не атаясамлівае сябе з рускімі. У сваім дзённіку ён запісаў, што іх крык з палубы ляцеў да роднай стараны і Расейскай зямлі. Большасць плылі па моры ўпершыню, і таму з трывогай ўзносілі малітвы Стварыцелю аб выратаванні ад небяспекі. Падчас плавання па Чорным моры ніякіх цікавых уражанняў не было, акрамя некалькіх убачаных вялікіх рыб. На наступны дзень 6 верасня ўсе захварэлі марской хваробай і не выходзілі на палубу любавацца марскімі прасторамі. 7 верасня мора супакоілася, і ў салдат на параходзе хвароба стала праходзіць. З захапленнем апавядае наш зямляк аб краявідах, якія адкрыліся перад імі, калі параход увайшоў у бухту Залаты Рог. Уразіла панарама сталіцы Турцыі Канстанцінопаля, так называе яе аўтар, а не Стамбулам. Кузняцоў заўважае і змяненне колеру вады на зялёны пры ўваходзе ў Міжземнае мора. Са здзіўленнем салдаты назіралі за дэльфінамі і марскімі свінкамі. Зацікавіла аўтара дзённіка і вада, якая была непада-

Рэпазіторый ВДУ

лёку ад вусця ракі Ніл, якая тут была афарбавана ў жоўты колер. Праплылі яны ад берага Егіпта, як піша наш салдат, усяго ў трох вярстах.

Чарговы прыпынак быў ў Порт-Саідзе, які знаходзіцца ў пачатку Суэцкага канала. Тут іх віталі з французскага парахода з крыкамі: "Русь". Французскія салдаты таксама накіроўваліся на тэатр ваенных дзеянняў у Кітай. Александрыя па апісанні нашага земляка – гэта горад егіпцян і турак, горад маляўнічы, дамы ўсе каменныя. Падрабязна апісвае Кузняцоў адрозненні ў вопратцы арабаў і турак. Здзіўляюць нашага земляка і натоўпы людзей, якімі запоўнены вуліцы, вялікая колькасць крамаў і асабліва купцоў, якія зазываюць да сябе купіць тавар. Бачыў Кузняцоў шмат папрашаек, які крычалі: "Рус карош, дай дзяньгу!". Параўноўвае салдат і цэны, аб якіх занатоўвае ў сваім нататніку. Напрыклад, тая рэч, што ў Расіі каштуе 50 капеек, тут яна ў пяць разоў больш танная. Хлопчыкі-арабы ўсе чорнаскурыя, блішчаць на твары толькі зубы. Жанчын на вуліцах амаль нябачна, а ў тых, якія з'яўляюцца, твары закрыты пакрывалам. Як апісвае Ізыдор Кузняцоў, былі ўзаемныя візіты французаў і рускіх салдат і афіцэраў. Французскі параход адплываў першым, і развітанне было таксама сяброўскім.

Далей аўтар дзённіка змяшчае апісанне плавання па Суэцкім канале, нават указвае яго шырыню ў 40 сажняў. Наш зямляк уважліва прыглядаецца да берагоў Аравійскага паўвострава, дзе няма ніякай расліннасці, а толькі зрэдку можна ўбачыць караваны вярблюдаў. Дзякуючы ліхтарам, па берагах канала наш аўтар разглядаў пры іх свецe сустрэчныя караблі, якія траплялiся на іх шляху па Суэцкім канале. Мінуўшы горад Суэц, параход увайшоў у Чырвонае мора. Тут ўсе пачалі адчуваць страшную спёку, якая дасягала 35 градусаў у цені. Ад гарачыні пачала балець галава ў салдат, каб хоць крыху аблегчыць свой стан абліваліся з кранаў на палубе вадою. 14 верасня спякота пачынае яшчэ больш узмацняцца, салдатам для падмацавання сіл сталі даваць ром. Чым бліжэй карабель плыў на поўдзень, тым больш дакучала рускім салдатам спёка, якая пачала даходзіць да 48 градусаў у цені, а пазней нават да 56 і вышэй. Вайскоўцы пакутавалі ад каросты, падобнай на воспу, пачаліся абапрэласці скуры. Каб пазбегнуць далейшага пагаршэння стану, салдатам дазволілі, як піша Ізыдор, распрануцца да "касцюма Адама". Ветрык, якога так чакалі, калі і павеяў, то не толькі не ахалоджваў, але як быццам усе траплялі ад яго ў распаленную печ. Вада ў брызенце ад сонца рабілася нібы кіпень.

19 верасня, мінуўшы горад Адэн, параход з рускімі салдатамі трапляе ў Індыйскі акіян. Падчас плавання па акіяне нашага земляка асабліва ўразілі вулканы, якія дыміліся ўдалечыні. Здзівілі яго і індзійскія рыбакі, якія на трох звязаных бярвеннях заплывалі далёка ў акіян для лоўлі рыбы. Падрабязна апісана Кузняцовым сталіца вострава Цэйлон – Каломба, дзе рускія салдаты сышлі на бераг, каб адпачыць пасля доўгага марскога шляху, а таксама для загрузкі вугалем, які служыў палівам для парахода. Першае, што ўразіла на востраве нашага земляка – водар паветра ад лімонавых і апельсінавых дрэваў. Здзіўляла, што можна было самому зрываць без дазволу і ласавацца экзатычнай садавінай. Цікава яму было бачыць і людзей, запрэжаных у павозкі з двума коламі, якія маглі за невялікую плату везці куды патрэбна. Салдат Кузняцоў і тут дакладна апавядае аб жыхарах вострава, іх вопратцы і харчаванні. 4 верасня параход, загрузіўшыся вугалем, пакінуў востраў. А 25–26 верасня параход трапіў у марскую буру, якую шчасліва пераадолеў. 30 верасня напярэдадні свята Пакрова Прасвятой Багародзіцы на караблі быў адслужаны начны малебен. Захапіла рускіх салдат і прырода вострава Суматра сваім багаццем і маляўнічасцю навакольнай прыроды.

Наступны порт, куды трапіў параход і які ішоў курсам на Далёкі Усход, быў горад Сінгапур. Тут ізноў здзівілі нашага земляка танныя цэны на птушак і жывёлу. Таму для весялосці салдаты купілі 50 малпаў па 20 кап. За адну жывёліну і 20 папугаяў па 10 кап за птушку.

Трэцяга кастрычніка параход увайшоў ва Ўсходне-Кітайскае мора. На палубах пачалося баявое дзяжурства, бо асцерагаліся нападу кітайцаў. Пятага кастрычніка карабель трапіў у чарговы шторм, хвалі перакідваліся праз палубу і здавалася, што параход вось-вось патоне. Спякота і галавакружэнне, качка парахода так змучалі салдат, што ўсе ляжалі як мёртвыя.

Толькі дзявятага кастрычніка бура сціхла і параход увайшоў у Карэйскі заліў, дзе спыніўся ў горадзе Кайтэне. Тут Ізыдор Кузняцоў апісвае знешні выгляд будучых ворагаў – кітайцаў, іх дамы, вуліцы горада. 10 кастрычніка карабель увайшоў у Карэйскі заліў, спякота скончылася, і далей шлях палягчэў, стала нават сцюдзёна, салдаты выходзілі на палубу ў шынялях. Марскі шлях закончыўся ва Уладзівастоку 18 кастрычніка. 20 кастрычніка салдаты ўжо паехалі чыгункай да горада Нікольск-Усурыйскі, дзе іх пасялілі ў казармах 3-га Усходне-Сібірскага палка.

Рэпазіторый ВДУ

Запіскі Кузняцова заканчваюцца якраз 3 снежня, калі рускае войска адправілася на барацьбу з кітайскімі паўстанцамі.

Са старонкі 104-й у нататніку ізноў змяшчаюцца песні. З іх першая, найбольш папулярная: "Ну, ребята, марш домой. Вольно в рассыпную. Службу кончили и пой – грянем удалую". Няма аналагаў варыянтаў песень, якія мы знайшлі ў запісах Кузняцова: "Ни отец, ни мать родная..", "Вечер поздно из лесочка, я коров домой гнала", "Тихо стало за морями, водворилась тишина..". Змешчаны і тэкст папулярнай лірычнай песні кампазітара Аляксандра Варламава (1801–1848) "Ненаглядный ты мой, как люблю я тебя". Запісана і самая вядомая ў рускіх салдат казка "Салдат у пекле", але новы яе варыянт.

З распіскі, змешчанай у нататніку, мы даведваемся, што наш зямляк быў звольнены ў запас 14 красавіка 1902 года, пра што паведамляе аб прыняцці яго на працу прыказчыкам ў лаўку Пятра Кузняцова ў г. Благавешчанску. Калі Ізыдор вярнуўся на радзіму, як склаўся яго далейшы лёс, з запісной кніжкі мы не даведваемся. Зразумела, што ён жывым вярнуўся на радзіму. Такім чынам, вывучэнне запісаў Ізыдора Кузняцова дазваляе яскрава зразумець светаўспрыманне рускага салдата на пераломе XIX – XX стагоддзяў.


1. Запісная кніжка яфрэйтара І. Кузняцова // Гістарычны музей СШ №3 г.Міёры. – Рукапісны фонд. – № 145.
2. Янчевецкий, Д. Г. У стен недвижного Китая. Дневник кореспондента "Нового Края" на театре военных действий в Китае 1900 года / Д. Г. Янчевецкий. – СПб., 1903. – 618 с.


**Барановский А.В.**

## ФОТОАЛЬБОМЫ СВЯЦКИХ КАК ИСТОРИЧЕСКИЙ ИСТОЧНИК ПО ИСТОРИИ АГРОГОРОДКА ПЛАМЯ СЕННЕНСКОГО РАЙОНА

В современной историографии к визуальному документу, и прежде всего фотографии, стали относиться как к источнику. Для фотографии характерен высокий уровень наглядности и достоверности запечатлённой информации. Чаще всего в центре внимания фотографа оказывается человек. По фотографиям мы часто можем определить половозрастную, религиозную, этническую, политическую принадлежность людей. Огромную роль при анализе фотографий играет предметный мир, окружающий сфотографированных. Очень важно качество и степень сохранности фотоматериала, с которым работает исследователь. Большая удача если фотография подписана и датирована, что позволяет чётко локализовать место и хронологический отрезок.

В последнее время благодаря развитию Интернета и тиражированию фотографий появилась возможность получать новые источники по истории того или иного населённого пункта. В нашем распоряжении оказались три фотоальбома последних владельцев имения Белица – Свяцких. Данные фотоальбомы были размещены на сайте Национальной электронной библиотеки Польши (https://polona.pl). В них содержатся достаточно редкие снимки, благодаря которым можно представить повседневную жизнь имения.

Агрогородок Пламя является центром Белицкого сельсовета Сенненского района Витебской области. В середине XIX века это было имение Белица, которое после Октябрьской революции переименовали в Пламя. Последними владельцами Белицы был род Свяцких. Иосиф Михайлович Свяцкий приобрёл Белицу 23 ноября 1856 года [1.2, л. 11]. Он был маршалком Сенненского уезда. Его жена была с роду Ваньковичей. У Иосифа было двое детей – Карл и Мария. Про Марию Свяцкую сведений почти не сохранилось. Известно только, что она в 1909 году была членом общества польского просвещения и благотворительности. Скорее всего, что после 1909 года Мария вышла замуж и уехала из Белицы [1.1, с. 12].

27 января 1891 года, Белица по наследству перешла к Карлу Свяцкаму [1.2, с. 11]. Он владел имением до 1918 года. 18 июля 1894 года Карл Свяцкий женился на Марии Донимирской [1.11, с. 5]. Мария была родом из прусской провинции – Померании. У Карла и Марии родился сын Станислав, который был крещен 7 мая 1895 года в Сеннеском костеле [1.4, л. 6].

Три фотоальбома запечатлели разные моменты из жизни Карла Свяцкого и его семьи. Следует отметить, что благодаря данным фотографиям мы узнали, как выглядели сами владельцы имения – Свяцкие. В середине XIX века в Белице они закончили строительство кирпичного усадебного дома в стиле позднего классицизма. После он был частично перестроен и увеличен. В фотоальбомах содержится 8 фотографий внешнего вида усадебного дома, а также 7 фотогра-



Репозиторий ВГУ